**Заданні для правядзення ўступных іспытаў па гісторыі Беларусі**

Выберыце правільныя адказы. Звярніце ўвагу, што ў пытаннях можа быць некалькі правільных адказаў.

**1. Найбольш старажытным тыпам земляробства на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца:**
а) ворыўнае; б) падсечна-агнявое (ляднае); в) матычнае; г) пераложнае.

**2. Ва ўсходніх славян свабодных сялян абшчыннікаў называлі:**
а) халопамі; б) баярамі; в) чэляддзю; г) людзінамі.

**3. Тураўскае княства ўтварылася на аснове племяннога аб'яднання:**
а) дрыгавічоў; б) крывічоў; в) радзімічаў; г) хазараў.

**4. Вызначце галоўную павіннасць сялян на карысць землеўладальніка ў ВКЛ да канца 15ст.:**
а) даніна; б) падводная; в) дзесяціна; г) хатнія работы.

**5. Сведчаннем захавання дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай было:**
а) стварэнне Галоўнага трыбунала;
б) прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г.;
в) існаванне агульнага сойма;
г) увядзенне уніяцтва.

**6. Вызначце наступствы заключэння Берасцейскай (Брэсцкай) царкоўнай уніі для ВКЛ:**
а) большасць насельніцтва ВКЛ прынялі кальвінізм;
б) праваслаўная царква стала пануючай у Рэчы Паспалітай;
в) тры чвэрці насельніцтва Беларусі сталі уніятамі;
г) забаронена дзейнасць каталіцкай царквы ў ВКЛ.

**7. Вызначце палітычную задачу Рэчы Паспалітай у другой палове 18ст.:**
а) замацаванне свайго панавання ў Паўночнай Еўропе;
б) удзел у барацьбе за выхад да Чорнага мора;
в) скасаванне Люблінскай уніі;
г) пераадоленне ўнутранага палітычнага крызісу.

**8. Полацкі сабор 1839 г. прыняў рашэнне далучыць уніяцкую царкву да:**
а) каталіцкай; б) пратэстанцкай; в) стараверскай; 4) праваслаўнай.

**9. Вызначце прозвішча аднаго з першых даследчыкаў беларускай гісторыі, вуснай народнай творчасці і мовы ў першай палове 19ст.:**
а) П. Шпілеўскі; б) В. Ваньковіч; в) С. Манюшка; г) І. Аляшкевіч.

**10. У адпаведнасці з Маніфестам 19 лютага 1861г. селянін атрымліваў права:**
а) удзельнічаць у выбарах органаў улады; б) не служыць у арміі;
в) паступаць у навучальныя установы; г) адразу выкупіць зямлю.

**11. «Прускі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы абумовіла аграрная рэформа:**
а) П. Кісялёва; б) П. Сталыпіна; в) Жыгімонта II Аўгуста; г) Аляксандра II.

**12. Вызначце палітычную арганізацыю, якая ў 80-х гг. 19ст. шырока выкарыстоўвала індывідуальны тэрор:**
а) Бунд; б) «Народная воля»; в) «Гоман»; г) «Саюз 17 кастрычніка».

**13. Аднаўленне дзейнасці беларускага нацыянальнага руху ў гады Першай сусветнай вайны пачалося са стварэння:**
а) "Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны";
б) "Дэмакратычнага таварыства";
в) Літоўскага правінцыяльнага таварыства;
г) грамадскага камітэта парадку.

**14. Пасля завяршэння вайны 1812г. царскі ўрад у беларускіх губернях:**
а) выселіў шляхту, якая падтрымала Напалеона;
б) кампенсаваў сялянам матэрыяльныя страты;
в) аднавіў дзеянне Канстытуцыі 1791г.;
г) захаваў прыгонніцкія парадкі.

**15. Вызначце падзею першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, якая вымусіла царскі ўрад абвясціць Маніфест:**
а) «Крывавая нядзеля»;
б) Кастрычніцкая ўсерасійская палітычная стачка;
в) Курлоўскі расстрэл у Мінску;
г) спробы паўстанняў у Баранавічах і Гомелі.

**16. Прачытайце вытрымку з дакумента і запішыце назву сістэмы поглядаў, аб якой гаворыцца ў тэксце.**

"...існуе вялікая патрэба ведаць Заходнюю Расію па-руску і ўводзіць у гэта веданне і разуменне мільёны...простых маларусаў, беларусаў і літвінаў...Называючы ўсю гэту краіну Заходняй Расіяй, мы відавочна, глядзім на яе з сярэдзіннай часткі рускай дзяржавы...а калі адтуль глядзець на захад, то можна без вялікай памылкі назваць Заходняй расіяй не толькі Беларусь, але і Украіну, і Літву".

**17. Пазнайце гістарычную асобу і запішыце прозвішча.**

Вядомы палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Займаў вышэйшыя дзяржаўныя пасады канцлера, гетмана вялікага літоўскага. Адзін са складальнікаў і рэдактар Статута 1588г.

**18. Устанавіце адпаведнасць паміж элементамі двух мностваў (гісторыя Рэчы Паспалітай):**

| | |
|---|---|
| А) бітва пад Лоевам; | 1) Лівонская вайна 1558-1583г.г. |
| Б) паходы на Маскву | 2) вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай 1632-1634г.г. |
| В) захоп Полацка войскамі Івана Грознага | 3) казацка-сялянская вайна 1648-1651г.г. |
| Г) барацьба за Смаленск | 4) інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расію 1604-1618г.г |

**19. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў 16 - 18ст. у ВКЛ:**

А) наданне магдэбургскага права гораду Мінску — 1) АВБГ

Б) заключэнне Крэўскай уніі — 2) БГВА

В) прыняцце Судзебніка Казіміра — 3) БАВГ

Г) бітва пад Грунвальдам — 4) ВГАБ

**20. Устанавіце паслядоўнасці падзей, якія адбываліся ў 19 – пачатку 20ст.:**

А) увядзенне земстваў на тэрыторыі Беларусі — 1) ГАБВ

Б) заснаванне Ф.Савічам "Дэмакратычнага таварыства" — 2) БГАВ

В) Лютаўская рэвалюцыя — 3) БВАГ

Г) стварэнне Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП) — 4) АГБВ